Міністэрства сувязі і інфарматызацыі выпускае ў абарачэнне тры паштовыя маркі на тэму «Гомельшчына» з серыі «Беларускі край»

14 верасня 2024 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне тры паштовыя маркі на тэму «Гомельшчына» з серыі «Беларускі край».

Маркі друкаваліся таксама ў малым лісце.

Дызайн С. Цырулік. Фота С. Плыткевіча, І. Шыпілавай, А. Саладкова, В. Дземуковай, КУП «Рэдакцыя газеты «Гомельская праўда». Дызайн канверта Першага дня Я. Бядонік.

Маркі друкаваліся ў РУП «Бабруйская ўзбуйненая друкарня імя А.Ц. Непагодзіна».

Гомельская вобласць – найбуйнейшая па тэрыторыі вобласць Беларусі. Абласны цэнтр – горад Гомель.

Запаведная прырода беларускага Палесся, унікальныя пойменныя дубровы і найбагацейшая фаўна ракі Прыпяць, старажытны Тураў (упершыню згадваецца пад 980 годам у «Аповесці мінулых гадоў»), а таксама Гомель, Мазыр, Рэчыца, Добруш і Лоеў – бясцэнная спадчына Гомельшчыны.

У рэгіёне знаходзіцца мноства помнікаў археалогіі, гісторыі, культуры і архітэктуры, праходзяць знакавыя фестывалі рэгіянальнага, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў.

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Гомельскім абласным выканаўчым камітэтам.

У дзень выпуску паштовых марак у абарачэнне ў аддзяленні паштовай сувязі № 48 Гомеля будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

Да выпуску падрыхтаваны карткі для картмаксімумаў.

Source URL: *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/node/9737*